ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 6 (926) | АЎТОРАК, 8 красавіка 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Па ўстаноўленаму графіку ў кожны апошні чацвер месяца праводзяцца пасяджэнні Савета нашага універсітэта. На гэты раз яно адбылося 27 сакавіка.

Першай на парадку дня была заслухана і абмеркавана справаздача аб рабоце факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, з якой выступіў яго дэкан дацэнт А.А.Малахаў.

Начальнік вучэбнага аддзела Н.І.Папкова праінфармавала аб абмеркаванні вынікаў зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі на саветах факультэтаў.

Інжынер НДС А.У.Гаеў далажыў аб навукова-даследчай рабоце студэнтаў.

Вучоны сакратар дацэнт Л.Я.Палякоў паведаміў, як выконваюцца рашэнні Савета універсітэта.

Па інфармацыях прарэктара па навуковай рабоце прафесара Д.Р.Ліна прынята рашэнне аб адкрыцці часовага навуковага калектыву, зацверджаны тэмы кандыдацкай і доктарскіх дысертацый, прыняты рэкамендацыі па дапаніраванню рукапісаў навуковых артыкулаў.

Саветам ўведзены ў навучальныя рабочыя планы курс "Ахова працы", адкрыта новая спецыялізацыя па кафедры АСАІ, разгледжана пытанне аб удзеле ў конкурсе праектаў фундаментальных і пошукавых даследаванняў (фонд "Навука-97").

## АБАРАНІЎ ДОКТАРСКУЮ ДЫСЕРТАЦЫЮ

На мінулым тыдні ў чацвер вельмі важны экзамен у сваім жыцці трымаў кандыдат фізіка-матэматычных навук прафесар кафедры алгебры і геаметрыі В.С.Манахаў. Віктар Сцяпанавіч паспяхова абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук. Абарона праходзіла на пасяджэнні спецыялізаванага Савета, створанага пры нашым універсітэце.

(Больш падрабязна аб гэтай падзеі чытайце ў наступным нумары нашай газеты).

## РАБОЧЫ ВІЗІТ ФРАНЦУЗСКІХ КАЛЕГ



Усё больш цесным становіцца супрацоўніцтва ГДУ з французскімі калегамі, як па міжнароднай праграме ТАСІС (ТЭМПУС), мэтай якога з"яўляецца ўдасканаленне сістэмы кіравання універсітэтам, так і ў рамках стварэнага сумеснага Франка-беларускага інстытута кіравання.

Гэтымі днямі ў ГДУ знаходзілася вялікая група французскіх гасцей -- 4 выкладчыкі, 19 студэнтаў, 7 стажораў з Франка-беларускага інстытута, а таксама асобы, якія прыехалі ў ГДУ для падвядзення вынікаў першага этапа работы па праграме "ТЭМПУС", яе эксперты.

Французскія госці падрабязна пазнаёміліся з нашай ВНУ, зрабілі цікавыя экскурсіі па Гомелю і яго ваколіцах, у сталіцу Беларусі -- Мінск. Французскія выкладчыкі праводзілі сумесныя заняткі для беларускіх і замежных студэнтаў па менеджменту. Моладзь мела магчымасць бліжэй пазнаёміцца са студэнцкім жыццём у нашай ВНУ так, як гэта маглі зрабіць студэнты ГДУ ў час свайго нядаўняга знаходжання ў Клермон-Феране.

На здымку: французскія госці -- у ГДУ.

Фота У.Чысціка.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры эканомікі і сацыялогіі працы АКУЛІЧ Мікалай Уладзіміравіч ўзнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

◆◆◆

*За шматгадовую плённую працоўную дзейнасць, дасягнутыя поспехі ў рабоце, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта галоўны бухгалтар КУРАВА Іраіда Антонаўна ўзнагароджана Ганаровай граматай ГДУ.*

## ПРАФСАЮЗУ -- БОЛЬШУЮ АКТЫЎНАСЦЬ

Прайшлі справаздачы і выбары ў прафсаюзных арганізацыях факультэтаў нашага універсітэта. Завяршаюцца яны і ў прафгрупах. На сходах падведзены вынікі работы за справаздачны перыяд, на якіх адзначалася не толькі станоўчае, але і ўказвалася на недахопы. Галоўная ўвага звярталася на павышэнне актыўнасці прафбюро і прафоргаў з мэтай больш паспяховага вырашэння ўсіх пытанняў і праблем, якія выкліканы сучасным складаным сацыяльна-эканамічным становішчам.

На факультэтах выбраны новыя саставы прафбюро і іх старшыні: на філалагічным -- **Н.І.Колтышава**, біялагічным -- **А.Г.Рыбальчанка**, фізічнай культуры -- **В.П.Крукоўскі**, геолага-геаграфічным -- **В.В.Коцур**, эканамічным -- **А.Л.Вайцішкіна**, гісторыка-юрыдычным -- **А.Я.Рычкоў**, фізічным -- **М.М.Фядосенка**, матэматычным -- **В.Л.Мяржа.** У прафсаюзных групах прафгрупоргамі на новы тэрмін выбраны: у калектыве бібліятэкі -- **А.Г.Місачэнка**, ІВЦ -- **Т.І.Казачкова**, бухгалтэрыі -- **В.Л.Бельчанка**, упраўлення -- **В.І.Старакожава;** кафедр: англійскай мовы -- **Г.У.Лоўгач**, нямецкай мовы -- **П.В.Рэзько**, псіхалогіі -- **І.М.Елісеева.**

На прафсаюзных сходах выбраны дэлегаты на агульнауніверсітэцкую прафсаюзную канферэнцыю, якую прадугледжваецца правесці 21 красавіка. На ёй будзе заслухана і абмеркавана справаздача старшыні прафкома Г.І.Варатніцкага.

РАЗМЕРКАВАННЕ МАЛАДЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

# РАБОТА ЁСЦЬ! РАБОТЫ НЯМА...

Студэнцкае жыццё ўмоўна можна падзяліць на некалькі адметных этапаў. І, бадай, самы адказны і хвалюючы з іх -- размеркаванне выпускнікоў на працу.

Гады вучобы пралятаюць вельмі хутка і настае час выбару свайго далейшага шляху. Якім ён будзе, залежыць сёння не толькі ад маладога спецыяліста, багажу атрыманых ім ведаў. Эканамічная нестабільнасць у краіне самым непасрэдным чынам уплывае і на "рынак працы", месца ў якім могуць не знайсці сабе, на жаль, і некаторыя выпускнікі з дыпломамі аб вышэйшай адукацыі, што набылі вытворчыя спецыяльнасці. Па гэтай прычыне вымушаны станавіцца на ўлік на біржу працы і выпускнікі ГДУ імя Ф.Скарыны. Такая карціна назіраецца ўжо не першы год. Сярод беспрацоўных у мінулыя гады аказваліся таксама маладыя людзі, якія набылі педагагічныя спецыяльнасці. Але гэта здаралася, як кажуць, па іх "уласнай ініцыятыве", бо школы вобласці пастаянна адчуваюць патрэбу ў настаўніцкіх кадрах, аднак маладыя спецыялісты не спяшаюцца пакідаць горад, каб паехаць на працу ў раённыя і вясковыя школы Гомельшчыны.

Сёлета ж сітуацыя з размеркаваннем выпускнікоў-педагогаў карэнным чынам змянілася. Згодна Палажэння Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 2 жніўня 1996 г. аб размеркаванні выпускнікоў дзяржаўных педагагічных вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў уведзена абавязковае размеркаванне маладых спецыялістаў. Хочуць яны ці не, а ехаць на перыферыю, дзе вельмі патрэбны настаўнікі па ўсіх прадметах вучэбнага цыкла, будзе неабходна. Так званых свабодных дыпломаў пры адмове выпускнікоў ехаць працаваць на вёску, як у мінулыя гады, дзяржаўная размеркавальная камісія ім не давала. Выключэнне складалі толькі пэўныя катэгорыі студэнтаў, якія згодна існуючага палажэння маюць на гэта законнае права.

Практычна ва ўсіх раёнах Гомельшчыны ёсць вакансіі педагогаў, якія згодна заяўкі Міністэрства адукацыі трэба запаўняць. Туды і атрымлівалі накіраванні філолагі, біёлагі, географы, гісторыкі, матэматыкі, фізікі, знаўцы замежных моў, спецыялісты фізічнай культуры.

Да выпускнікоў-філолагаў, якія мелі высокі бал паспяховасці і размяркоўваліся ў ліку першых, члены дзяржаўнай камісіі прыглядаліся найбольш уважліва, каб выдзеліць з іх таленавітых і здольных для работы ў абласным ліцэі, дзе вучацца асабліва адораныя дзеці. Ліцэй адкрыўся ў бягучым навучальным годзе і з"яўляецца базавым для нашага універсітэта. Да выкладчыкаў, якія ў ім працуюць, прад"яўляюцца вышэйшыя патрабаванні, чым у звычайнай школе -- ім трэба рыхтаваць вучняў так, каб яны потым паступалі ў ГДУ. Весці тут заняткі прапанавана выпускніцы спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" Алене Шынгірэй, а таксама Таццяне Шумскай і Анжэліцы Клявенка з рускага аддзялення. На работу ў ліцэй накіравана і выпускніца факультэта фізічнай культуры майстар спорту рэспублікі па шматбор"ю "Здароўе" Таццяна Аляксухіна.

Некаторыя выдатнікі вучобы застаюцца працаваць ва універсітэце: на кафедры нямецкай мовы -- Іван Сідарэйка, агульнай фізікі -- Аляксей Калеснікаў, геалогіі -- Аляксей Царкоў, на ІВЦ -- Канстанцін Вулах, Віталь Навіцкі.

Не ўзнікла ніякіх праблем з размеркаваннем фізікаў вытворчага патоку. Бачна, што на факультэце добра наладжана работа па пошуку заказчыкаў на сваіх спецыялістаў. Ды і самі выпускнікі актыўна праяўляюць асабістую ініцыятыву, каб знайсці сабе месца работы. Іх з задавальненнем бяруць у свой штат сумесныя прадпрыемствы, вытворча-камерцыйныя фірмы, акцыянерныя таварыствы. Павучыцца ў іх так наладжваць справу можна і астатнім факультэтам, такім, напрыклад, як эканамічны. Бо сёлета тут таксама нямала маладых спецыялістаў могуць застацца без месц працы.

Як і раней складаная сітуацыя застаецца з выпускнікамі спецыяльнасці "Гідрагеалогія і інжынерная геалогія": размеркаванне ва ўсе рэгіёны былога СНД даўно ў мінулым. І ў роднай Беларусі, на Гомельшчыне не знаходзяць яны зараз прымянення сваім ведам: з 15 сёлетніх маладых спецыялістаў палова пакуль засталася без накіравання.

... Звыш 800 выпускнікоў ГДУ імя Ф.Скарыны -- на парозе працоўнага жыцця. Няхай жа як мага менш з іх папоўняць рады беспрацоўных.

Т.ДУБЯК.



**На здымку: выпускніцы філалагічнага факультэта Т.Шумская, А.Шынгірэй і А.Клявенка атрымалі накіраванні на працу ў абласны ліцэй.**

**Фота У.Чысціка.**



Традыцыі

# БІЁЛАГІ -- НАРОД ЦІКАВЫ І ТАЛЕНАВІТЫ

Ніхто не будзе аспрэчваць той факт, што вучыцца на біялагічным факультэце даволі складана. Шмат трэба працаваць, каб мець станоўчыя адзнакі па шматлікіх прыродазнаўчых дысцыплінах. Але гэта не азначае, што студэнты біяфака -- народ сумны і нецікавы, зацыклены на адной вучобе. Якраз адваротнае даказваюць яны ў час традыцыйных "Дзён біялагічнага факультэта", якія праводзяцца ўжо не першы год у пачатку вясны.

Вось і нядаўна на працягу апошняга тыдня сакавіка факультэт жыў у прыўзнятай атмасферы свята. Яго праграма была вельмі разнастайнай, насычанай і цікавай. І самі студэнты, і іх выкладчыкі не засталіся раўнадушнымі да ўсіх мерапрыемстваў, што праходзілі ў гэтыя дні.

Адкрыла праграму навуковая студэнцкая канферэнцыя, на якой з дакладамі выступалі як старшакурснікі, так і іх малодшыя сябры. Іх тэматыка сведчыла аб тым, што студэнты пасля заканчэння вучобы ў ГДУ змогуць не толькі выкладаць у школе біялогію і хімію, але і ўдзельнічаць у вырашэнні шматлікіх экалагічных праблем нашага рэгіёна, у тым ліку звязаных з вынікамі аварыі на ЧАЭС. Многія даклады былі пабудаваны на самастойна праведзеных студэнтамі даследаваннях, эксперыментах, што ўяўляецца асабліва каштоўным. Будучыя біёлагі, як адзначыў на адкрыцці канферэнцыі прарэктар па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін, праяўляюць вялікую актыўнасць у навукова-даследчай рабоце. Сфера практычнага прымянення іх даследаванняў даволі шырокая, таму іх мэтазгодна выкарыстоўваць для паспяховага вырашэння сённяшніх экалагічных праблем у вобласці. Гэтую думку падкрэсліў намеснік начальніка абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы акаляючага асяроддзя І.П.Галубінскі, які таксама прысутнічаў на канферэнцыі.



**З дакладам на студэнцкай навуковай канферэнцыі выступае пяцікурсніца Алена Смолік.**

А ў тым, што сярод студэнтаў біяфака шмат не толькі даследчыкаў, але і талентаў у мастацкай творчасці, засведчыла выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Тут было на што паглядзець! І што самае цікавае, былі сярод шматлікіх экспанатаў работы, якія змаглі зрабіць менавіта біёлагі, з іх бачаннем і веданнем прыроды, яе цікавых таямніц. Камплект упрыгажэнняў другакурсніцы В.Шаўцовай, напрыклад, здзіўляў і фантазіяй, і тэхнікай выканання, і матэрыялам, што ў сукупнасці дало выдатны вынік. А кошык, зроблены з сасновых шышак І.Лянковай, выглядаў як сапраўдны твор мастацтва. Прыцягвалі ўвагу прадстаўленыя на выстаўцы малюнкі. Нехта са студэнтаў пажартаваў: "Многім выпускнікам факультэта можна выдаваць яшчэ адзін дыплом -- мастака, бо даводзіцца шмат альбомаў з замалёўкамі розных прыродных кампанентаў выкладчыкам здаць."

" Дні факультэта" -- гэта яшчэ і цікавыя сустрэчы: з вучонымі горада, якіх сюды запрашаюць, са студэнтамі-выпускнікамі розных гадоў, выкладчыкамі, якія ўжо на заслужаным адпачынку. Адна з такіх цёплых і запамінальных сустрэч адбылася, у прыватнасці, на кафедры батанікі і фізіялогіі раслін. Яна сабрала разам і сённяшніх яе выкладчыкаў, і тых, хто стаяў ля яе вытокаў, рабіў усё для яе станаўлення і развіцця, і выпускнікоў, хто ўжо змог дасягнуць у рабоце па набытай тут спецыяльнасці пэўных вышынь. У дружалюбнай атмасферы, каля самавара з гарачым чаем дзяліліся яны ўспамінамі, прыгадвалі і радасныя, і кур'ёзныя выпадкі з тых студэнцкіх гадоў, з палявых вучэбных практык на прыродзе.

Студэнты праявілі свае таленты, здольнасці, падрыхтаванасць па вывучаемых дысцыплінах і на іншых мерапрыемствах "Дзён біёлага" -- на пленарных і секцыйных пасяджэннях канферэнцый на кафедрах хіміі, заалогіі і аховы прыроды, фізіялогіі чалавека і жывелін, на экалагічных чытаннях, у час хімічнай віктарыны і... у конкурсе кулінарных вырабаў.

Завяршаючым акордам свята факультэта стаў канцэрт мастацкай самадзейнасці, які прайшоў на сцэне актавай залы. Будучыя біёлагі даказалі, што ім падуладны ўсе жанры -- ад сур'ёзных, класічных да гумарыстычных, што прынесла гледачам сапраўднае задавальненне.

Т.НІКАЛАЕВА.



**Пераможцы хімічнай алімпіяды.**

**Фота У.Чысціка.**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА І КУРС ДЗЁННАГА АДДЗЯЛЕННЯ НА 1997-1998 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Ва універсітэт прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю і пастаянна пражываюць у рэспубліцы, грамадзяне Беларусі і беларусы, якія пражываюць за яе межамі, а таксама грамадзяне Расійскай Федэрацыі.

**Прыём заяў -- з 26 чэрвеня па 15 ліпеня. Уступныя экзамены -- з 16 ліпеня, залічэнне ў састаў студэнтаў: па плану -- да 5 жніўня, на ўмовах аплаты -- да 25 жніўня.**

Паступаючыя на спецыяльнасць "Правазнаўства" здаюць 4 конкурсныя экзамены. Паступаючыя на ўсе іншыя спецыяльнасці здаюць 3 конкурсныя экзамены (паступаючыя на спецыяльнасць "Фізічная культура і спорт" дадаткова здаюць 1 пазаконкурсны экзамен). Абітурыенты, якія не з"явіліся на экзамен без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да далейшых экзаменаў не дапускаюцца. Уступныя экзамены (за выключэннем экзаменаў па спецфізпадрыхтоўцы і плаванню для спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт") праводзяцца па праграмах, складзеных у адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі і зацверджаных Міністэрствам адукацыі.

Абітурыенты здаюць наступныя ўступныя экзамены:

| №№ | Спецыяльнасць | Экзамены |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| 1. | **Руская мова і літаратура** | 1. Руская мова і літаратура (сачыненне).<br>2. Руская мова і літаратура (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура (вусна). |
| 2. | **Руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура** | 1. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне).<br>2. Беларуская мова і літаратура (вусна).<br>3. Руская мова і літаратура (вусна). |
| 3. | **Беларуская мова і літаратура** | 1. Беларуская мова і літаратура (сачыненне).<br>2. Беларуская мова і літаратура (вусна).<br>3. Руская мова і літаратура (вусна). |
| 4. | **Беларуская мова і літаратура і англійская мова** | 1. Беларуская мова і літаратура (сачыненне).<br>2. Англійская мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура (вусна). |
| 5. | **Англійская мова** | 1. Англійская мова (вусна).<br>2. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (вусна). |
| 6. | **Нямецкая мова** | 1. Нямецкая мова (вусна).<br>2. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (вусна). |
| 7. | **Матэматыка** | 1. Матэматыка (вусна).<br>2. Матэматыка (пісьмова).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 8. | **Бухгалтарскі улік, аналіз і аўдыт** | --//-- |
| 9. | **Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве** | --//-- |
| 10. | **Камерцыйная дзейнасць** | --//-- |
| 11. | **Фінансы і крэдыт** | --//-- |
| 12. | **Прыкладная матэматыка** | --//-- |
| 13. | **Фізіка (вытворчае і педагагічнае аддзяленні)** | 1. Фізіка (вусна).<br>2. Матэматыка (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 14. | **Фізіка з дадатковай спецыяльнасцю "тэхнічная творчасць"** | --//-- |
| 15. | **Фізічная электроніка** | --//-- |
| 16. | **Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі** | --//-- |
| 17. | **Геалогія і разведка карысных выкапняў** | --//-- |
| 18. | **Гісторыя** | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Замежная мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (вусна). |
| 19. | **Гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю "англійская мова"** | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Англійская мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (вусна). |
| 20. | **Гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю "нямецкая мова"** | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Нямецкая мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (вусна). |
| 21. | **Правазнаўства** | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Сусветная гісторыя (вусна).<br>3. Замежная мова (вусна).<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (вусна). |
| 22. | **Геаграфія** | 1. Геаграфія (вусна).<br>2. Замежная мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 23. | **Геаграфія з дадатковай спецыяльнасцю "англійская мова"** | 1. Геаграфія (вусна).<br>2. Англійская мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 24. | **Геаграфія з дадатковай спецыяльнасцю "нямецкая мова"** | 1. Геаграфія (вусна).<br>2. Нямецкая мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 25. | **Псіхалогія** | 1. Біялогія (вусна).<br>2. Матэматыка (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 26. | **Біялогія** | 1. Біялогія (вусна).<br>2. Хімія (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 27. | **Фізічная культура і спорт (агульна-педагагічнае і спартыўна-педагагічнае аддзяленні)** | 1. Экзамен па спецфізпадрыхтоўцы.<br>2. Біялогія (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (вусна).<br>4. Плаванне (пазаконкурсны экзамен). |



Абітурыенты, якія паступаюць на ўсе спецыяльнасці, акрамя першых 4, указаных у табліцы, здаюць па выбару абавязковы экзамен па беларускай мове і літаратуры або рускай мове і літаратуры. Паступаючыя на спецыяльнасць "Руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура" пішуць па выбару сачыненне па беларускай мове і літаратуры або рускай мове і літаратуры.

Экзамены па замежнай мове для здвоеных спецыяльнасцей (спецыяльнасці 4, 19, 20, 23, 24 у табліцы) прымаюцца па правілах, прадугледжаных для спецыяльнасцей "Англійская мова", "Нямецкая мова".

Выпускнікам сельскіх школ, а таксама пражываючым у зонах радыяцыйнага забруджання, даецца права пры паступленні на спецыяльнасці "Правазнаўства", "Гісторыя" і "Геаграфія" замест уступнага экзамена па замежнай мове здаваць уступны экзамен па беларускай мове,калі абавязковы экзамен яны здаюць на рускай мове, або па рускай мове, калі абавязковы экзамен яны здаюць па беларускай мове.

Экзамен па спецфізпадрыхтоўцы для абітурыентаў, якія паступаюць на спартыўна-педагагічнае аддзяленне спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт", праводзіцца па спецыялізацыях.

Без экзаменаў залічваюцца пераможцы (I, II, III месцы) міжнародных, а таксама рэспубліканскіх алімпіяд выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў і педвучылішчаў, праведзеных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1996-97 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці. Пераможцы (I, II, III месцы) абласных і Мінскага абласнога тураў алімпіяд выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў 1996-97 навучальнага года, якія праводзіліся органамі кіравання адукацыяй па агульнаадукацыйных прадметах, вызваляюцца ад уступных экзаменаў па гэтай дысцыпліне з выстаўленнем адзнакі "выдатна" пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці.

Асобы, якія закончылі сярэднюю навучальную ўстанову з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову або ПТВ з дыпломам з адзнакай, здаюць усе ўступныя экзамены.

Універсітэт праводзіць здачу папярэдніх экзаменаў для асоб, якія паспяхова вучацца на факультэце давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі па прадстаўленні дэканата гэтага факультэта. Здача гэтых экзаменаў праводзіцца **з 17 па 26 мая**. Асобы, якія паспяхова здалі папярэднія экзамены, удзельнічаюць з атрыманымі адзнакамі ў конкурсе разам з абітурыентамі, якія здаюць уступныя экзамены ў летні час. Асобы, якія жадаюць палепшыць адзнакі, атрыманыя на папярэдніх экзаменах, здаюць у перыяд **з 16 ліпеня** ўсе ўступныя экзамены і паступаюць ва універсітэт на агульных падставах.

Выпускнікі падрыхтоўчага аддзялення залічваюцца ў адпаведнасці з палажэннем аб ім.

Універсітэт аб"яўляе мэтавы кантрактны прыём на педагагічныя спецыяльнасці і спецыяльнасць "Правазнаўства". Залічэнне абітурыентаў на ўмовах мэтавай кантрактнай падрыхтоўкі спецыялістаў ажыццяўляецца згодна даведзеных планаў мэтавага прыёму і адпаведных палажэнняў.

Залічэнне ва універсітэт праводзіцца па конкурсу ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на ўступных конкурсных экзаменах. Конкурс праводзіцца па спецыяльнасцях. Для спецыяльнасцей "Фізіка" і "Фізічная культура і спорт" конкурс праводзіцца па аддзяленнях спецыяльнасцей.

Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца:

-- воіны-інтэрнацыяналісты;

-- інваліды 1 і 2 груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі;

-- асобы, якія [illegible]ць ільготы ў адпаведнасці з арт. 18 Закона Рэспублікі Бе-

**(Заканчэнне на 6 стар.)**

Уражанні

# РОК, ФАЛЬКЛОР І СУЧАСНЫЯ ТАНЦАВАЛЬНЫЯ МАТЫВЫ...

*Канцэрт, з якім выступаў на сцэне актавай залы ГДУ беларускі гурт "Палац", застаўся ўжо ў мінулым. Але тыя студэнты, якія на яго трапілі, успамінаюць аб ім яшчэ і зараз...*

У мінулым месяцы ў нашым універсітэце адбыўся "клёвы" канцэрт знакамітага ва ўсёй Еўропе гурта "Палац". Нам, студэнтам універсітэта, пашчасціла трапіць на гэтую святочную тусоўку.

У актавай зале сабраліся тыя, каго паклікала сюды цікавасць, жаданне далучыцца да шматлікай аўдыторыі паклоннікаў і паслухаць спевакоў ужывую, а не па радыё.

Нарэшце, выйшлі на сцэну тыя, каго называюць гуртам "Палац". Яны прыйшлі не адны, бо з імі былі заўсёдныя іх спадарожнікі -- шум, жарты, смех і тое, дзеля чаго яны існуюць -- іх музыка і песні. Тэксты песень гурта -- гэта неапрацаваныя беларускія народныя песні, якія музыканты запісвалі ў розных кутках Беларусі. Гэты гурт заўсёды вылучала іх своеасаблівая музыка, у якой цудоўна спалучаюцца рок, фальклорныя і сучасныя танцавальныя матывы, якія так паважае наша моладзь.

Гэта было першае турнэ музыкантаў па беларускіх гарадах. Яно аказалася ўсё ж такі ўдалым, бо нават тыя, хто быў на канцэрце, упэўніліся, што беларускую музыку можна і трэба слухаць, тым больш, што яе слухаюць і ў Польшчы, і ў Германіі, і ў Італіі, дзе гурт з поспехам удзельнічаў у музычных фестывалях.

Можна нагадаць такі факт: гурт "Палац" разам з другім не менш вядомым беларускім гуртам "Крама" быў прадстаўлены на міжнародным музычным рынку "МІДЭМ", які праходзіў у Канах у лютым 1995 года. Выканаўцы паказалі, што беларуская мова -- не перашкода для выхаду на музычныя рынкі ні Расіі, ні Еўропы. Музыка гурта "Палац" была сустрэта цёпла, нават з зацікаўленасцю. Гэтага выканаўцы заслугоўваюць.

**Вольга МЯЖЭНЬКА,**
**Алена МІШАКОВА,**
**студэнткі V курса філалагічнага факультэта.**

# ЛЮБЯЦЬ І ВЕДАЮЦЬ АНГЛІЙСКУЮ МОВУ

Ва універсітэце праведзена алімпіяда па англійскай мове сярод студэнтаў нямоўных спецыяльнасцей. Самыя лепшыя веды па замежнай мове паказалі на ёй будучыя правазнаўцы Маргарыта Ергучова (гр. П-23, выкладчыца Г.У.Лоўгач), Вікторыя Савасценка (гр. П-ІІ, выкладчыца Т.В.Смолава), а таксама другакурсніца біялагічнага факультэта Вераніка Шыцікава, дзе заняткі вядзе М.І.Кулік. Яны занялі адпаведна І, ІІ, ІІІ месцы.

Добрае валоданне англійскай мовай прадэманстравалі таксама П.Сцяпанаў (гр. П-23), А.Шаўцоў з фізічнага факультэта, будучы эканаміст С.Раманчук, першакурснік гістарычнага аддзялення У.Алдошкін і С.Малашанка з гр. П-12.

Названыя студэнты прынялі ўдзел і ў гарадской алімпіядзе па англійскай мове. Пераможцы універсітэцкай алімпіяды зноў у такім жа парадку (М.Ергучова, В.Савасценка, В.Шыцікава) і тут заваявалі тры прызавыя месцы, падзяліўшы іх са студэнтамі БелДУТа і мединстытута.

Пераможцы заахвочаны прызамі.

Вясёлы перапынак

# АБ ПЕРААДОЛЕННІ ЦЯЖКАСЦЕЙ...

З цяжкасцю прачнуўся. З цяжкасцю падняўся. З цяжкасцю ўлез у тралейбус. З цяжкасцю вылез. З цяжкасцю даказаў, што не спазніўся. З цяжкасцю дачакаўся абеду. З цяжкасцю дасядзеў да канца работы. З цяжкасцю злавіў таксі. З цяжкасцю расплаціўся. З цяжкасцю паспеў да месца сустрэчы. З цяжкасцю ўгаварыў прадаць пасля сямі. З цяжкасцю памятаю, што было і чым скончылася. З цяжкасцю дабраўся да дому. З цяжкасцю заснуў.

Як жа мне ўсё гэта ўдаецца з такой лёгкасцю?..

ДА ЎВАГІ СТУДЭНТАЎ

# ПЛАТА ЗА ІНТЭРНАТ ПАВЫШАЕЦЦА

Загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь N117 зацверджана Палажэнне аб дыферэнцыраванай аплаце за карыстанне інтэрнатамі дзяржаўных навучальных устаноў.

Плата за карыстанне інтэрнатамі для студэнтаў устанаўліваецца ў залежнасці ад умоў пражывання (разраду інтэрнатаў).

У нашым універсітэце інтэрнаты адносяцца да двух разрадаў: інтэрнаты N1, 2 -- ІІІ разрад; N3, 4 -- ІІ разрад.

Адпаведна плата за інтэрнат для студэнтаў і слухачоў падрыхтоўчага аддзялення будзе: ІІ разрад -- 24% ад мінімальнай заработнай платы, ІІІ разрад -- 23% ад мінімальнай заработнай платы.

**В.ГАПЕЕЎ,**
**начальнік аддзела выхаваўчай работы.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- гісторыі Беларусі -- асістэнта;
-- эканамічных тэорый -- заг.кафедры, дацэнта;
-- англійскай мовы -- выкладчыка;
-- тэорыі і практыкі англійскай мовы -- выкладчыкаў (4);
-- французскай мовы -- выкладчыка;
-- нямецкай мовы -- выкладчыка;
-- псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі -- асістэнта;
-- заалогіі і аховы прыроды -- асістэнта;
-- геаэкалогіі -- дацэнта;
-- лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту -- дацэнта;
-- аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры -- выкладчыка;
-- тэорыі і гісторыі дзяржавы і права -- загадчыка кафедры.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 118.
Падпісана да друку 4.04.97.